Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: ***e-krama.com, www.pahonia.org***
Электронны адрас: ***viestki@mail.com***
✉ ***VIESTKI, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735***

№ 3 (577)
Сакавік 2014 г.

Шаноўныя сябры!

Кіраўніцтва Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" вядзе падрыхтоўку да ўрачыстага сьвяткаваньня 96-й гадавіны абвешчаньня незалежнасьці

БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Аб месьце і часе імпрэзы будзе паведамлена ў самы бліжэйшы час на ўэбстаронках Згуртаваньня "Пагоня" (***pahonia.com***) і бюлетэня "Весткі й Паведамленьні" (***e-krama.com***)/

Калі ласка, сачыце за абвесткамі й падтрымайце высілкі нашых актывістаў сваім удзелам.



Акцыя ў Нью-Ёрку ў падтрымку ўкраінскага Майдану



У нядзелю 16 лютага на Мангэтане на Калюмбус-Сыркл каля Сэнтрал Парку прайшла акцыя ў падтрымку змаганьня ўкраінцаў за свабоду і дэмакратыю ва Ўкраіне, супраць алігархічнага ўраду прарасейскага прэзыдэнта Януковіча і супраць умяшаньня Расеі ва ўкраінскія справы.

Як вядома, цягам некалькіх месяцаў украінцы праводзяць сталую дэманстрацыю-змаганьне за дэмакратызацыю сваёй краіны, адхіленьне ад улады скампрамэтаванага ўраду і прэзыдэнта. Супрацьстаяньне маніфэстантаў і сілавых структураў ужо прынесла першыя ахвяры – адна зь іх у асобе грамадзяніна Беларусі М. Жызьнеўскага з Гомельшчыны, што браў удзел у змаганьні поруч з украінцамі й загінуў на барыкадах Эўрамайдану. Наагул, на здымках і відэазапісах з Майдану відаць шмат беларускіх нацыянальных сьцягоў і трапляюцца плякаты па-беларуску, шмат беларусаў бяруць удзел у падзеях у Кіеве ды іншых мясьцінах братняй Украіны.

Мітынг быў скліканы ўкраінскімі арганізацыямі, але на ім былі таксама прадстаўнікі іншых нацыянальных групаў былога Савецкага Саюзу, у тым ліку беларусы. Бралі ўдзел у мітынгу таксама і прадстаўнікі Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня". Былі відаць беларускія сьцягі й плякаты. Прадстаўнік беларусаў ад арганізацыі "Беларусы ў экзылі" сп. Дзьмітры Шчыгельскі выступіў на мітынгу і ў сваёй прамове адзначыў, што змаганьне ва Ўкраіне вельмі важнае таксама і для беларусаў, і што вынік падзеяў на Майдане будзе мець вялікі ўплыў на становішча ў Беларусі. Менавіта таму беларусы ў Амэрыцы і па ўсім сьвеце мусяць падтрымаць змаганьне за дэмакратыю сваіх украінскіх братоў і суседзяў.

Як стала вядома на момант выхаду гэтага нумару "Вестак і Паведамленьняў", змаганьне ва Ўкраіне абвастрылася і прынесла ўжо некалькі дзясяткаў загінуўшых і многія сотні параненых. Украінскі народ плоціць высокую цану за сваю свабоду і, безумоўна, гэтыя ахвяры зьменяць і Ўкраіну, і ўсю Эўропу.

Паводле by24.org

Лютаўскі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу 8 лютага адбыўся чарговы сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу старшыня Згуртаваньня Віталь Зайка распавёў пра навіны за апошні месяц, коратка спыніўся на падзеях у Беларусі, ва Ўкраіне, згадаў пра славуты Майдан у Кіеве і пра сьмерць на Майдане беларуса з Гомельшчыны Жызьнеўскага, які поруч з іншымі прадстаўнікамі нацыянальных беларускіх сілаў браў удзел у змаганьні за свабоду й дэмакратыю братняга беларусам украінскага народу, згодна з ідэаламі старадаўняга лёзунгу нацыянальна-вызвольнага руху “За нашу і вашу свабоду!”.

Затым сп. Зайка згадаў 110-годзьдзе пачатку расейска-японскай вайны, што прыпадае акурат на 8 лютага. У гэтай вайне бралі ўдзел таксама і беларускія людзі, мабілізаваныя ў царскае войска. Сп. Зайка сказаў, што ў той вайне бралі ўдзел і ягоныя продкі, пра якіх захаваліся сямейныя аповяды і фатакарткі. Прамоўца сьцісла распавёў пра ход вайны і пасьля адзначыў, што параза Расеі ў той вайне выклікала ланцуг падзеяў, якія прывялі да кляпца царскага самаўладзьдзя, які цяпер, на адлегласьці амаль стагодзьдзя, можа быць ацэнены больш аб’ектыўна. Рэвалюцыя многімі разглядаецца цяпер як прэлюдыя да велізарнай гуманітарнай катастрофы, грамадзянскай вайны і ўсталяваньня бальшавіцкага рэжыму, што каштавала мільёнаў жыцьцяў і завярнула народы на землях былой імпэрыі ў кірунку, адваротным нармальнаму эўрапейскаму разьвіцьцю. І ў выніку Беларусь дасюль яшчэ туляецца нейдзе ў тым бядотным грамадзкім ды эканамічным кірунку.

Затым сябар управы і скарбнік Віктар Едзіновіч выступіў з сваімі развагамі пра некаторыя аспэкты расейска-японскай вайны і таксама адважна паспрабаваў спалучыць і вытлумачыць некаторыя не да канца вывучаныя аспэкты магчымага ўзаемадзеяньня з іншаплянэтнымі цывілізацыямі, на падставе шэрагу гіпотэзаў і фальклёрных матэрыялаў. Развагі пра іншаплянэтчыкаў ды іншае выклікалі шэраг заўвагаў і непрыняцьце збоку некаторых прысутных, але, у кожным выпадку, гэта падняло тонус настрою ў залі й увагу ўдзельнікаў.

Затым перад прысутнымі выступіў госьць Згуртаваньня, кіраўнік арганізацыі “Беларусы ў экзылі” Дзьмітры Шчыгельскі. Напачатку ён зьбіраўся рабіць прэзэнтацыю па-расейску, спаслаўшыся на “нядаўнія ўсплёскі нацыяналізму”, маючы на ўвазе колішнія, вырваныя з кантэксту словы ў прамове прадстаўніка КХП Ю. Беленькага. У выніку кароткай дыскусіі сп. Шчыгельскі быў запэўнены, што “Пагоня” адкрытая для ўсіх, але менавіта беларуская мова, зацісканая і прыніжаная на Бацькаўшчыне, вымагае ўвагі й падтрымкі, незалежна ад нейкіх асобных апініяў ці падзеяў. Выступоўца ўрэшце пагадзіўся і працягваў па-беларуску. Ён спыніўся на супольнай акцыі трох арганізацыяў, “Пагоні”, Вашынгтонскага аддзелу БАЗА і “Беларусаў у экзылі”, што прайшла ў мінулым месяцы ў Вашынгтоне. Гэтай падзеяй быў пікет перад амбасадай Беларусі ў Вашынгтоне супраць нарады па інвэстыцыях у эканоміку рэжыму Лукашэнкі, якую амбасада праводзіла з дапамогаю “Фонду Эўразіі”, і на якую прыйшла пэўная колькасьць патэнцыйных інвэстараў, зацікаўленых даведацца болей пра тыя суперпрыбыткі, якія абяцае рэжым у абмен на інвэстыцыі.

Справа ў тым, што з падачы Джэмстаўн-фундацыі, у якой спэцыялістамі па Беларусі лічацца досыць адыёзныя асобы кшталту Рыгора Іофэ і Ўладзімера Сокара, усё больш пашыранай робіцца апінія, што апазыцыя ў Беларусі ня мае пэрспэктываў, і каб супрацьстаяць Расеі, трэба выкарыстоўваць Беларусь як разьменную манэту, і дзеля гэтага кантактаваць і “разьвіваць адносіны з адміністрацыяй прэзыдэнта Лукашэнкі”. Такая пазыцыя пры крытычным разглядзе не вытрымлівае крытыкі, але, нягледзячы на гэта, мае сваіх прыхільнікаў. А рэжым мае наіўных патэнцыйных інвэстараў, якім прага прыбыткаў засьціць глузды й здаровы сэнс.

Вось для такіх і было падрыхтаванае прыймо ў амбасадзе РБ у Вашынгтоне. Функцыя пікету была наступная: прыцягнуць увагу тых, каго заманілі ў свае мярэжы прадстаўнікі рэжыму, да становішча ў Беларусі й да нелегітымнасьці існуючага рэжыму, а таксама папярэдзіць, што супрацоўніцтва зь незаконным рэжымам будзе мець адмоўны ўплыў на ўкладзеныя ў гэты рэжым сродкі, а прэтэнзіі ў будучым на кампэнсацыю тых страчаных сродкаў ня будуць задавальняцца. Таму важна паказаць, што папярэджаньні ёсьць, што ёсьць інфармаваньне наконт небясьпекі гульняў з рэжымам. І патрабаваць, каб крэдыты, напрыклад, ад МВФ, даваліся толькі з умовамі і праз траншы толькі па выкананьні тых умоваў. Як вядома, у Беларусі няма незалежнага суду, выкананьне дамоваў і законаў не гарантаванае, адпаведна, рызыка інвэстыцыям зьяўляецца надзвычай высокай, і таму высокі праектаваны працэнт прыбыткаў на ўкладаньні – па 100-200%. І рызыканты знаходзяцца. Вось іх і трэба раз-пораз вяртаць да рэаліяў.

Цяпер Беларусь мае досыць высокі ўзровень запазычанасьці, і дзеяньні па прыцягненьні рэжымам крэдытаў ды інвэстыцыяў толькі падвышаюць гэтую запазычанасьць, што дасягнула ўжо ўзроўню каля 4 тысяч даляраў на сярэднюю сям’ю. Улічваючы, што каля 20% насельніцтва Беларусі пэнсіянэры, гэта вельмі значная сума.

Далей сп. Шчыгельскі адзначыў, што хоць пікет быў нешматлюдны, але зрабіў сваю справу, расьцягнуты ўдзельнікамі банэр ясна адлюстроўваў ягоную ідэю. Непрыемнай рысай цяперашняга пікету быў агрэсыўны настрой паліцыі, непрыязнае стаўленьне да ўдзельнікаў. Ля невялікай групы пратэстоўцаў трымалі аж тры паліцэйскія машыны, і паліцыянты ўвесь час прыгаворвалі: “Як што-якое, адразу накладаем кайданкі – і ў пастарунак”. Уважаючы спакойны і разважаны стыль правядзеньня пікету, рэзкі тон і стаўленьне паліцыі падаюцца абсалютна неадэкватнымі, але напэўна ў нечым адлюстроўваюць настроі ў цяперашняй адміністацыі прэзыдэнта Абамы. Падтрымка дэмакратыі, нават хай сабе й дэкляратыўна, ужо ня згадваецца; маўчаньне пра Беларусь працягваецца.

Сп. Шчыгельскі затым адказаў на пытаньні прысутных і заўважыў, між іншага, што добра карыстаць з магчымасьці пэтыцыяў на сайце Белага дому, бо з фармальнага боку гэта мае юрыдычны сэнс, у адрозьненьне ад подпісаў, скажам, на сайце Change. Ёсьць пляны зьвярнуцца да адміністрацыі Абамы з патрабаваньнем выканаць Будапешцкую дамову 1994 году, па якой краіны-гаранты, у тым ліку ЗША, забавязаліся адстойваць сувэрэнітэт Беларусі, які цяпер парушаецца праз умяшаньне Расеі ва ўнутрыбеларускія справы, лябіяваньне й накіданьне сваёй АЭС, небясьпечнасьць умоваў, на якіх яна будуецца, і г.д. Выступ сп. Шчыгельскага быў з цікавасьцю сустрэты прысутнымі.

У традыцыйным разьдзеле “Рознае” затым адбыліся знаёмствы з гасьцямі Згуртаваньня “Пагоня”, і ўдзельнікі сходу мелі нагоду працягнуць занёмствы й калегаваньне пры сьціплых пачастунках.

Віталь ЗАЙКА

Беларусь – Амэрыка: лёсы землякоў

Міхась Міцкевіч і беларуская грамада Амэрыкі

Беларускі грамадзкі, культурніцкі й рэлігійны дзеяч Міхась Міцкевіч (1897-1991), малодшы брат Якуба Коласа, псэўдонімы Антось Галіна, М-ч, ММ (гл. Бібліяграфію "Беларускі друк на Захадзе" В. Кіпеля) пакінуў заўважны сьлед у гісторыі беларускай грамады ў Нью-Ёрку.

Ён нарадзіўся ў славутай цяпер вёсцы Мікалаеўшчына (Мікалаўшчына) Стаўпецкага павету ў 1897 годзе, і змалу далучыўся да сялянскай працы на гаспадарцы, апісанай Якубам Коласам у паэме "Новая Зямля". Дзядзька Антось, галоўны герой паэмы, у жыцьці зрабіў вялікі ўплыў на Міхася, які пазьней узяў сабе псэўдонім ў ягоны гонар, з дадаткам прозьвішча "Галіна" – як працяг роду, справы. У маладыя гады, па прыкладзе брата, узяўся да пісаньня, друкаваўся ў беларускіх выданьнях. У 1917 г. Міхась скончыў Сьвіслацкую настаўніцкую сэмінарыю, якая зрабілася кузьняй нацыянальнай адраджэнскай працы, і, зьяўляючыся студэнтам якой, Міхась Міцкевіч пачаў друкавацца ў беларускіх выданьнях. На яго зьвярнулі ўвагу Максім Багдановіч і Максім Гарэцкі. Міцкевіч браў удзел у працы Першага Ўсебеларускага Кангрэсу ў 1917 годзе. У 1919-1920 гадох М. Міцкевіч працаваў у Менскай беларускай гімназіі, выкладаў беларускую мову.

Пасьля Першай сусьветнай вайны родныя мясьціны апынуліся пад польскай адміністрацыяй, і настаўніцкая беларуская дзейнасьць Міхася была амаль немажлівая. Ён працаваў на гаспадарцы, актыўна падтрымліваў беларускую нацыянальную ідэю, адукацыю па-беларуску і нават браў удзел у выбарах у Сэйм ад Цантральнага Саюзу Культурніцкіх і Грамадзкіх арганізацыяў (Цэнтрасаюз) у 1930 г. З прыходам Саветаў М. Міцкевіч стаў настаўнічаць у родных мясьцінах, але пабачыў, што беларуская мова і культура для Саветаў – толькі фармальнасьць, эпізод на шляху да русіфікацыі. Будучы сьведкам таго, як беларуская мова імкліва выціскалася Саветамі з усіх сфэраў грамадзкага жыцьця Беларусі, і як трапляў пад рэпрэсіі кожны, хто, на думку НКВД, мог быць незадавальны з гэтага – М. Міцкевіч стаў перакананым апанэнтам Саветаў і камуністычнай улады.

У час вайны Міхась Міцкевіч быў інспэктарам беларускіх школаў на Стаўпецкую акругу, імкнуўся наладзіць беларускамоўную адукацыю ў складаных умовах, калі падтрымка беларускай справы была трактаваная як калабарацыя і пагражала стратай жыцьця ад рук савецкіх і польскіх партызанаў. З набліжэньнем савецкіх войскаў заставацца было небясьпечна, бо Міхась Міцкевіч выдатна ведаў, што рабілі Саветы зь беларускімі патрыётамі да вайны. Цяпер жа, са зручным абвінавачаньнем у "дапамозе фашыстам", расправа зь беларускімі нацыянальнымі дзеячамі была яшчэ больш хуткая й бязьлітасная. Міхась Міцкевіч падаўся на захад, у Нямеччыну.



Па вайне Міцкевіч апынуўся ў ДП-лягеры Розэнгайм, браў удзел у культурніцкім жыцьці беларускай грамады дыпісаў. Затым, калі беларусы з ДП-лягераў сталі пераяжджаць далей на Захад, Міхась Міцкевіч перабраўся ў 1950 годзе ў Амэрыку. Тут ён далучыўся да нацыянальнага і рэлігійнага жыцьця беларускай грамады. У 1953 годзе пераняў рэдактарства газэты "Беларус" ад Н. Арсеньневай і Ф. Кушаля, зь якімі быў у сяброўскіх адносінах.

Стаў актыўным дзеячом беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, быў сябрам царкоўнай рады сабору сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью-Ёрку. Асноўнай працай было дагляданьне могілак, касіў траву, садзіў кветкі. Праца на вольным паветры, што ў нечым нагадвала працу ў родных мясьцінах, на гаспадарцы. Дарэчы, казаў неяк, што ў Фляшынгу знайшоў на могілках памнік з надпісам "Я беларус". Напачатку 1960-х выйшаў на пэнсію і склаў абавязкі рэдактара газэты "Беларус". Пасьля гэтага перанёс сваю актыўнасьць цалкам на царкоўную ніву. Рэдагаваў каля 15 год часапіс "Царкоўны Сьветач", пераклаў на беларускую мову шэраг літургічных тэкстаў.

Акрамя гэтага, М. Міцкевіч быў адміністратарам беларускай нядзельнай школы, часам вёў заняткі па беларускай мове. Ён зрабіў пераклад па-беларуску чатырох Эвангеляў. Выконваў абавязкі адміністратара сабору сьв. Кірылы Тураўскага на 401 Атлянтык авэню ў Брукліне.

Міхась Міцкевіч рабіў даклады й рэфэраты ў БІНіМе, распавядаў пра БНР, свой жыцьцёвы досьвед, сваю слаўную сям'ю. Па словах сучасьнікаў, ён быў прыемны, пазытыўны чалавек, спакойны і разважаны, але разам з тым аматар добрага жарту.

Міхась Міцкевіч быў моцным антыкамуністам і ведаў, як падступна маніпулююць бальшавікі спадзяваньнямі працоўных людзей на лепшую долю. Таму ён браў актыўны ўдзел у антыкамуністычнай дзейнасьці эміграцкіх арганізацыяў паняволеных бальшавізмам народаў на Loyalty Day (першая нядзеля траўня). Гэты дзень удзячнасьці Амэрыцы, вынайдзены імігрантамі-антыкамуністамі з Усходняй Эўропы, ужываўся як антыдот і супрацьвага леваму пракамуністычнаму сьвяту "1-га Мая", што яшчэ дасюль адзначаюць левакі-радыкалы і прафсаюзныя актывісты ў Нью-Ёрку.

Міхась Міцкевіч пад канец жыцьця быў заклапочаны выданьнем сваіх эвангельскіх перакладаў. Яму дапамагаў у гэтым сваяк Мікола Прускі, што выдаў некалькі частак перакладу. Пасьля сьмерці М. Міцкевіча рукапісы ягоных перакладаў Эвангеляў апынуліся ў Менску ў Беларускім Экзархаце РПЦ. Невядома, ці аўтар зычыў гэткі лёс сваім творам, але ужо больш за 20 гадоў плён ягонай дзейнасьці ляжыць бяз руху ва ўстанове, што, дыпляматычна кажучы, надзвычай "асьцярожна" ставіцца да беларускай мовы і беларускай культуры. Застаецца выказаць спадзяваньне, што ўсё ж надыйдзе час, калі творы Міхася Міцкевіча будуць выдадзеныя на Бацькаўшчыне, і калі жыцьцёвы шлях гэтага слаўнага сына яе стане шырака вядомы ў Беларусі.

Віталь ЗАЙКА

“Галгатня пра ЗыШыА”

Viva la frontiera!

Як беларус заходнік, я ніколі ня мог надзівіцца высокім драўляным платам, багата расьсеяным па ўсходняй Беларусі. Як старажытныя муры гарадзішчаў, яны аддзяляюць сялібу ад цікаўных вачэй мінакоў. У нас, у заходняй Беларусі, высокіх платоў амаль нідзе не было, хіба што зрэдчас. Пераважна, з боку дарогі там можна сустрэць частакол з рэдзенькіх жэрдак, а паміж хатамі і гародамі пасаджаныя ўздоўж мяжы яблыні ці грушкі.

Цяперашняя ўлада, як і кожная прымітыўная ўлада ў сьвеце, вельмі любіць, каб усё было аднолькавым. Таму падчас навядзеньня местачковых эўрарамонтаў, без розьніцы на тое ці гэта ўсход, ці захад, усюды стаўляе ўніфікаваныя платы, якія звычайна пафарбаваныя ў адзін колер або ўзор. Прымітыўнаму розуму прасьцей жыць сярод аднастайнасьці, разумны прагне разнастайнасьці. Але далёка ня кожны нават разумны ўсьведамляе, што для захаваньня разнастайнасьці, як кісларод для жыцьця, патрэбная мяжа.



Мяжа гэтая можа быць нават нябачнай, але безь яе ніяк. Амэрыканцы, як некаторыя ведаюць з кіно, жывуць не адгароджваючыся. Зялёныя, роўна падстрыжаныя газоны, шлянгі з фыркаючым разьмеркавальнікам напору і характэрныя паштовыя скрыні ў форме жывалоўкі – гуманнай пасткі для мышэй. Бяда таму, хто думае, што адсутнасьць платоў азначае, што можна бадзяцца дзе і як заўгодна. Бадзякаў павінен адпудзіць надпіс „No trespassing”, што азначае ўваход забаронены, ці дакладней – мяжу не парушаць. Той, хто на перасьцярогі не рэагуе, мае ўсе шанцы даведацца, што мяжу амэрыканскага дому вызначае даўжыня рулі гаспадаровай стрэльбы, і што, асабліва на гарачым поўдні і дзікім захадзе краіны або ў адлюдных горных паселішчах на поўначы, дзьвярыма лепш за ўсё не памыляцца.

З прычыны на тое, што кулі палохаюць далёка ня ўсіх прыхадняў і бадзяк, у новай, дагэтуль бясплотавай Амэрыцы, раптам адрадзілася ўжо трохі прызабытая, але вельмі амэрыканская зьява – гароджаныя пасёлкі (gated communities). Звычайна, гэта абнесеныя здаравезным плотам раёны з відэаназіраньнем і прыватнай аховай – такая, своеасаблівая рэалізацыя ангельскага выслоўя „мая хата – мой замак” (a man’s house is his castle). Прашу ня блытаць з „мая хата з краю”. У гэтых пасёлках звычайна жывуць заможныя сем’і зь дзецьмі, а таму злодзеі, наркаманы і жыхары сламсаў там ня вельмі вітаюцца. Як можна лёгка здагадацца, для мясцовых бальшавікоў, якія дарэчы тут множацца як вошы, гароджаныя пасёлкі сядзяць хрэнам у горле.

Дык вось гэтыя самыя таварышы-галадранцы заклікаюць пазбавіцца межаў ва ўсім сьвеце. Яны, як сапраўдныя „інтэр-нацысты” ўслаўляюць умовы жыцьця ў інтэрнаце, з супольнай прыбіральняй на ўвесь калідор і кляймуюць тых, хто, незважаючы на відавочныя „перавагі” жыцьця ў калгасе, прагне вырвацца на свой, хай і невялічкі, але хутар. „Інтэрнацысты” будуюць адкрытыя грамадзтвы, разьмяркоўваюць кулацкія грошы і шчыра вераць у тое, што калі кожнаму пароўну, а не па заслугах – то гэта справядлівасьць. Таму, калі наступным разам ізноў пачуеце заклік „world without borders”, то памятайце, што хтосьці подступам плянуе загнаць вас у адзін бязьмежны Гулаг з адной, толькі нічым неабмежаванай мэтай...

Крэс – гэта свабода, мяжа – гэта ўласнасьць, плот – гэта права, ну а граніца – гэта жыцьцё.

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðààíüí³:

Ю. Бужынская .... .50
А. Генечка .... .50
Д. Громік .... .50
А. Дубіцкі .... .50
Т. Каўшовік .... .50
М. Кражова .... .50
А. Малчанаў .... .50
А. Солад .... .50
Г. Шаўчэнка .... .50

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя
Viktar Yedzinovich.

---

*Паважаныя **А. Бакчэеў, К. Кажэнаў, Ю. Караваева, В. Міхайлава, М. Самусь, Ю. Цяліца,** калі ласка, паведаміце рэдакцыі поштаю ці емэйлам вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца **ў суботу 8-га сакавіка 2014 году** на Мангэтане.

*У сходзе заплянаваны ўдзел адвакаткі **Мэрыян САРОНА**. Яна распавядзе пра іміграцыйныя законы ЗША і адкажа на пытаньні прысутных.*

Месца правядзеньня сходу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.

Заля знаходзіцца на другім паверсе будынка.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Веcткі й Паведамленьні* :

Ю. Бужынская .... .30
А. Генечка .... .30
Д. Громік .... .30
А. Гусак .... .30
А. Дубіцкі .... .30
Н. і С. Дудар .... .30
Я. Кацярыніч .... .30
А. Копат .... .30
М. Кражова .... .30
А. Чумакоў .... .30
Г. Шаўчэнка .... .30

Шчыры дзякуй!

---

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735
*Чэкі з адзнакаю **“Весткі”** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня “Пагоня” **Viktar Yedzinovich**.*
